

*У. Я.* ***Пузыня.***

так і не змаглі давесці справу да ладу: «разнамоўе» справакавала непаразуменне паміж імі і прывяло да таго, што «піва не зрабілі і хто ў сваю старану паляцелі». Пры ўсёй лапідарнасці сюжэтнага дзеяння казка быццам увабрала ў сябе розныя ў гістарычным плане пласты міфапаэтычнай рэчаіснасці. Вядома, напрыклад, што ў паўночных раёнах Мінскай вобласці існавала восеньская традыцыя варыць піва да свята ў гонар заканчэння збору ўраджаю. Таму пакладзеная ў аснову сюжэта ідэя гуртам згатаваць піва можа мець сакральна-абрадавы характар.

*Літ.*: Б а р а г Л.Р. Сюжэты і матывы беларускіх народных казак. Мн., 1978. С. 39.

*І. І. Крук.*

«**ПТУШЫНЫ ЦАР КУК**», этыялагічнае паданне, адна з версій разгалінаванага міфа пра паходжанне зязюлі і асаблівасці яе біялогіі. Існуюць два сюжэты, аб'яднаныя галоўным героем — царом птушак Кукам. Адзін з іх зарэгістраваны ў паказальніку казачных сюжэтаў паводле публікацыі У.Дабравольскага (СУС 221*). У сюжэце «П.ц.К.» герой пададзены страшным птушкаедам, які хоча пабудаваць палац або гняздо з касцей з'едзеных ім птушак. Птушкі дамаўляюцца забіць цара Кука, па сігнале зязюлі сокал выконвае прысуд — забівае яго. Сюжэт падання «Зязюля і Кук» распавядае пра птушынага цара Кука як ахоўніка птушак ад звяроў. Аднойчы ён знік, птушкі забедавалі і сталі раіцца, каго паслаць на яго пошукі. Усе птушкі знаходзілі прычыны, каб адмовіцца — хто стары, хто малы, у каго дзеці малыя. Выбралі зязюлю: у яе ні гнязда, ні дзяцей, ні мужа. Далейшыя падзеі вобразна тлумачаць дзіўныя асаблівасці пазнейшых зязюліных паводзін. Перад дарогай зязюля знесла са страху яечка, ды ў яе не было гнязда. Птушкі дазволілі сваёй пасланніцы пакласці яечка ў чужое гняздо. Выседжваць і выкарміць птушаня ўзялі на сябе мясцовыя птушкі, толькі б зязюля ляцела на пошукі цара Кука. Зязюля паляцела і да гэтага часу шукае і кліча птушынага цара галасным воклічам: «Ку-ку! Ку-ку!». Адсюль і ўстойлівыя ўяўленні пра зязюлю як птушку-ўдаву, хоць звычайна «кожнай пачвары мусіць быць па пары». Гэта тлумачылі тым, што зязюля страціла свайго «кукуша» яшчэ ў час сусветнага патопу: кукуш яе неўзлюбіў і пакінуў (М.Нікіфароўскі). З таго часу зязюля нібыта спарваецца то з удодам («жыдоўская зязюля»), то з мужам вароны, то з каршуном, або жыве з салаўём, які таксама не мае сваёй салаўіхі. На Палессі занатаваны павер'і, нібыта вясной вуж «іграе» з зязюляй. Так міфалагічнае мысленне тлумачыла сабе загадкавыя з'явы прыроды.

*Літ.*: Легенды і паданні. Мн., 1983. С. 64; Н и к и ф о р о в с к и й Н.Я. Простонародные приметы и поверья... Витебск, 1897. С. 192—193.

*Л. М. Салавей.*

**ПУЗЫНЯ** Уладзімір Якаўлевіч (н. 26.2. 1940, Мінск), майстар-рэстаўратар нац. музычных інструментаў, выканаўца на іх, педагог. Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1994). Скончыў Мінскае музычнае вучылішча імя М.Глінкі (1964), Мінскі інстытут культуры (1989). У 1965—78 артыст Дзяржаўнага нар. аркестра Беларусі імя І.Жыновіча, адначасова з 1972 працаваў у Мінскім абласным, у рэспубліканскіх навукова-метадычных цэнтрах нар. творчасці і культурна-асветніцкай работы. З 1979 педагог-ілюстратар сярэдняй спецыяльнай музычнай школы пры Бел. кансерваторыі, старшы метадыст па фальклоры пры Мінскім аблас-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ным метадычным цэнтры. З 1982 майстар, у 1983—88 загадчык вучэбнай майстэрні па рэстаўрацыі, рамонце і вырабе нар. музычных інструментаў Мінскага інстытута культуры. Стваральнік музея бел. музычных старажытных інструментаў «Бел. хатка». Вырабляе бел. нар. музычныя інструменты: аэрафоны — сапранавыя, альтавыя, басовыя дудкі; жалейкі, дуды, трубы і інш.; хардафоны — колавая ліра, басэтля і інш. Выступае з ігрой на бел. музычных інструментах у канцэртных праграмах, фестывалях нар. творчасці і інш. Аўтар зб. «Лірнік» (1993), артыкулаў пра бел. нар. музычныя інструменты: «Беларуская дудка», «Беларуская жалейка», «Беларуская ліра», «Беларуская дуда», «Беларуская сурма», «Беларускія ўдарныя інструменты».

*А. Л. Карацееў.*

**ПУКСТ** Рыгор Канстанцінавіч (27.11. 1900, Гомель — 12.11.1960), кампазітар. Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1955). Скончыў Маскоўскую кансерваторыю (1928). З 1929 выкладаў у Омскім, у 1932—41 у Гомельскім музычных тэхнікумах, у 1944—49 і 1959—60 у Бел. кансерваторыі. З 1949 хормайстар, у 1953—58 мастацкі кіраўнік музычнага вяшчання Бел. радыё. Творчую дзейнасць пачаў з апрацовак бел. нар. песень «Ах ты, Нёман-рака», «Бульба», «Ой, ляцелі гусі», «Рабіна-рабінaчка», «Зязюленька» (1928). Глыбокае асэнсаванне П. інтанацыйных асаблівасцей нар. меласу спрыяла фарміраванню своеасаблівага мeладызму, які яскрава выявіўся ў лірычных вобразах твораў розных жанраў. У сімфоніях і операх побач з цытаваннем («Ляцела зязюля» ў 1-й сімфоніі, 1935; «Ой, ды зарадзілі», «Кума мая, кумачка» — у 2-й, 1944; «Ты, чырвоная каліна» — у 5-й, 1957; «Саўка да Грышка ладзілі дуду», «Юрачка» ў оперы «Марынка», пастаноўка 1955) ужывае і больш складаныя формы ўвасаблення бел. фальклору. У оперы «Машэка» (1945) нар. песня разнастайна прадстаўлена ў нар. сцэнах (хоры «Ішоў казёл па мяжы», «Гляну, гляну я ў ваконца», танец «Таўкачыкі»), сольных партыях Ганкі («Каціўся вяночак з поля») і Машэкі («Ты, старонка мая»). Апрацоўваў нар. песні для сімфанічнага аркестра (фантазія «Перапёлачка», 1947; «Ой, не кукуй, зязюленька», «На гары бяроза», «Красна дзеўка па беражочку хадзіла», «Сваток» — у 2-й сюіце, 1948), розных выканаўцаў (больш за 50 песень, у т.л. харавыя «Ляціць сарока», «Ой, пайду я лугам», «Павей, ветрык», «З-пад белага камушка», «Ой, на гары мак», «Ты, крапіва», «Там за садамі», «Жаваронaчкі, прыляціце» і інш.).

*Літ.:* Ж у р а в л е в Д.Н. Г.К.Пукст, заслуженный деятель искусств БССР. Мн., 1963.

*Т. А. Дубкова.*

**ПУ́ННІК**, «гаспадар» пуні, звычайна нябачная міфалагічная істота, якая жыве ў сядзібнай, лугавой ці лясной пуні (абавязкова са страхой і крокваmі). Любая макрэча, у т.л. і ад дажджу, які працякае скрозь страху, дзейнічае на П. разбуральна, што, магчыма, абумоўлена сувяззю П. з зямным агнём. Ад нябеснай вады П. паволі марнее, хоць і не даходзіць да пагібелі. Яна можа спасцігнуць П., як і іншых нячысцікаў, ад удару грому і маланкі. У такім выпадку ён, як і *Ёўнік*, ператвараецца ў пыл. П. можа матэрыялізавацца, набываць зрокавы вобраз, калі ў пуні ёсць сена. Аблічча П. звернута не столькі да прыроды, колькі да людзей: ён ачалавечаны, але захоўвае і «вегетатыўныя рысы». П. бачыцца чалавекападобнай істотай, хоць у ёй можна пазнаць ахапак дробнага забруджанага сена. На П. асядае многа павуціння, пылу і смецця ад сена і трухі, але ён не такі брудны, як Ёўнік, бо не пакрыты слоем сажы. Традыцыйны локус П. — кроквы, бэлькі пуні. Асноўны яго занятак — назіранне за ўсімі наведвальнікамі пуні, пацеха гульнямі і бойкамі моладзі, валтузнёй і віскам катоў, якія ловяць мышэй. Разам з тым П. не церпіць таго, як у гнёздах выводзяцца птушкі, што ўказвае на яго хтанічную прыроду, далучанасць да ніжняга яруса светабудовы і апазіцыйныя адносіны з прадстаўнікамі верхняга свету. П. не з'яўляецца дэманам, козні якога небяспечныя для жыцця чалавека. Ён можа толькі дзеля сваёй асалоды праз шчыліны і адтуліны пуні палохаць дзяцей ці паасобных прахожых, выдаючы гукі, характэрныя для прадстаўнікоў іншасвету: свіст, ненатуральнае аханне, хрып, жаласлівы енк.

*Літ.:* Н и к и ф о р о в с к и й Н.Я. Нечистики: Свод простонар. в Витебской Белоруссии сказаний о нечистой силе. Витебск, 1995.

*І. А. Швед.*

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ